# *“СПЕЮЦЬ У ПРЫЦЕМКАХ ЗОРЫ...”*

## ПАЭТ ВАСІЛЬ РАГАЎЦОЎ І КАМПАЗІТАР МІКОЛА ЯЦКОЎ



Міколу Яцкова і Васіля Рагаўцова злучыла Магілёўшчына. Што яшчэ яднае творцаў?.. Вернасць. Мікола Адамавіч адданы музыцы, песні, Васіль Іванавіч – беларускаму слову.

**Мікола Яцкоў** – выпускнік Магілёўскага культурна-асветнага вучылішча імя Н. К. Крупскай (1977), Мінскага інстытута культуры (1981) – шмат гадоў працуе дырэктарам Брылёўскага Дома культуры (Магілёўскі раён). Яго песні выконваюцца многімі вядомымі артыстамі, такімі, як Нэлі Багуслаўская, Надзея Мікуліч, Якаў Навуменка, Леанід Нікольскі, Святлана Селівон, Мікалай Скорыкаў, увайшлі яны і ў рэпертуар Дзяржаўнага канцэртнага аркестра пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга.

Больш за 700 вершаў беларускіх паэтаў паклаў на музыку магілёўскі кампазітар. З сярэдзіны 1990-х гг. пачалося яго творчае супрацоўніцтва з **Васілём Рагаўцовым** – прафесарам, доктарам філалагічных навук, не толькі руплівым даследчыкам, але і тонкім паэтам, аўтарам зборнікаў “Сутонне” (1995), “Долягляд” (1998; у мінулым нумары памылкова надрукавана “Далягляд”), сябрам Саюза беларускіх пісьменнікаў (з 1996 г.). Пра вершы В. Рагаўцова М. Яцкоў выказаўся так: у іх ужо закладзеная музыка душы, трэба толькі намагчыся і расшыфраваць яе.

Падрыхтавала
**Крысціна ПУЧЫНСКАЯ.**

*Звесткі пра М. Яцкова, а таксама песні на яго музыку “Ганначка” (верш К. Жука), “Гаспадыня” (верш А. Вадака), “Тумановы вечар” (верш Г. Вязніцкай) апублікаваныя ў нашым часопісе ў № 5-6 за 1999 г., песня “Браток-сусед” (верш К. Цыбульскага) – у кастрычніцкім нумары за 2001 г., “Вярніся” (верш М. Шабовіча) – у чэрвеньскім нумары за мінулы год.*

### НЕ ВЕРЦЕ...



*Не верце, што зоркі ніколі не грэюць,*
*ад зорак пагляды каханых цяплеюць,*
*ад сполаху зорак сэрцы дабрэюць,*
*ад яснага ззяння іх – душы шчырэюць.*

*Не верце, што дрэвы не тужаць ніколі,*
*зацята скрыпяць яны, стогнуць ад болю,*
*калі ім віхура выкручвае голле,*
*калі ў роднай птушкі сірочая доля.*

*Не верце, што рэкі не просяць напіцца*
*у сушу-спякоту, каб смагі пазбыцца,*
*сумуюць яны па сцюдзёных крыніцах,*
*ім сняцца начамі дажджы-навальніцы.*

*Не верце, што сэрца не знае спачыну,*
*што б'ецца яно увесь час несупынна.*
*Яно замірае на хвілю-часіну*
*Ад жаху, здзіўлення, пагляду дзяўчыны.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

*Засынай, мая заранка,*
*люлі, люлі, –*
*засынай,*
*і збудзіся росным ранкам*
*развясененай, як май.*

Прыпеў:
*Хай спяваюць калыханку*
*пераліўна салаўі,*
*хай пільнуюць сон да ранку*
*месяц з ночкаю ўдваіх.*

*Засынай, мой коцік, люлі...*
*Люлі, люлі, –*
*Засынай...*
*Краскі ўсе даўно паснулі,*
*толькі ты не спіш адна.*

Прыпеў.

*Засынай, мая заранка,*
*люлі, люлі, –*
*засынай...*
*І збудзіся росным ранкам*
*развясененай, як май.*

Прыпеў.

## КАЛЫХАНКА




## СПЕЮЦЬ У ПРЫЦЕМКАХ ЗОРЫ...

*Спеюць у прыцемках зоры,*
*месяц дрыготка блішчыць,*
*смехам срабрыстым азорыш*
*крылы збалелай душы.*

*Глянеш паглядам чароўным –*
*сэрца пазбавіш тугі;*
*зорна-блішчастая роўнядзь*
*лучыць душы берагі.*




## Я І ТЫ

*Выплывае раніца*
*з берагоў начы,*
*цемра сонцам раніцца,*
*нікне ў далячынь.*

Прыпеў:
*П'ём смугу крынічную*
*аж да нематы,*
*месяц з зоркай-znічкаю –*
*я і ты,*
*я і ты.*

*Вочы твае весняцца,*
*поўныя трывог.*
*Зарыпелі весніцы...*
*Маладзы мурог...*

Прыпеў.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова